ла благоприятные условия для периориентации внешнеполитического курса России. Экономическое соперничество подтолкнуло Россию сначала к экономическим связям, а затем и к политическому союзу с Францией.

[1] См.: Покровский С. А. Внешняя торговля и внешняя торговая политика России. М., 1947. С. 271.

[2] См.: Лященко П. И. История народного хозяйства СССР: В 3 т. М., 1956. Т. 2. С. 179.

[3] Среди городского дворянства эта группа составляла примерно половину и численность ее увеличивалась (Карелин А. П. Дворянство в пореформенной России. 1861—1904. М., 1979. С. 123).

[4] Вестник Европы. 1885. № 3. С. 407.

[5] Русский вестник. 1885. № 2. С. 897.

[6] Победоносцев и его корреспонденты. М.; Пг., 1923. Т. 1. Полутом 2. С. 541.

[7] Гражданин. 1885. № 55. С. 10.

[8] Русский вестник. 1885. № 2. С. 892—893; № 1. С. 901; 1886. № 4. С. 957; 1887. № 2. С. 978.

[9] Русская мысль. 1886. № 7. С. 153.

[10] Вестник Европы. 1885. № 8. С. 860.

[11] См.: Русская мысль. 1885. № 7. С. 25.

[12] Там же. 1886. № 7. С. 152, 153.

[13] Арсеньев К. К. За четверть века. Пг., 1915. С. 270.

[14] Там же. С. 323.

[15] Витте С. Ю. Воспоминания. М., 1960. Т. 1. С. 279.

[16] Письма Победоносцева к Александру III. М., 1926. Т. 2. С. 122—123.

[17] Там же. С. 97.

[18] Гражданин. 1887. № 7. С. 3.

В. А. ФЯДОСІК

## ХРЫСЦІЯНСКАЯ ЦАРКОЎНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ Ў РЫМСКАЙ ІМПЕРЫІ III — ПАЧАТКУ IV ст.

### (асноўныя тэндэнцыі развіцця)

III — пачатак IV ст. былі надзвычай важным этапам у гісторыі антычнага хрысціянства. У гэты час у хрысціянстве трывала ўсталявалася царкоўная арганізацыя. Ва ўмовах крызісу, што ахапіў Рымскую імперыю ў III ст., новая рэлігія знаходзіла ўсё больш і больш сваіх адэптаў у розных слаях грамадства. Хрысціянства ўпершыню падверглася рэпрэсіям з боку ўлад у агульнаімперскім маштабе, і, нарэшце, самае моцнае з антыхрысціянскіх ганенняў — «вялікае ганенне» імператара Дыяклетыяна літаральна праз некалькі гадоў змянілася афіцыйным прызнаннем хрысціянскай царквы дзяржаўнай уладай, пачаў складвацца саюз паміж царквой і дзяржавай. Працэсы эвалюцыі ў гэты час праходзілі больш інтэнсіўна, чым у першыя два стагоддзі існавання хрысціянства, і многае ў іх было якасна іншым, чым раней.

У гэтым артыкуле зроблена спроба асэнсаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця хрысціянскай царкоўнай арганізацыі ў вельмі важны перыяд яе існавання. Вядома, працэсы, што адбываліся ў царкве і ў пазацаркоўных плынях (ерасях), істотна адрозніваліся. Але калі ерасі, якія мелі яўны сацыяльны падтэкст, больш-менш вывучаліся савецкімі гісторыкамі, то даследаванне гісторыі царквы III — пачатку IV ст. з'яўляецца адной з «белых плям» у нашым навуковым хрысціяназнаўстве. Між тым вывучэнне эвалюцыі афіцыйнага царкоўнага кірунку ў хрысціянстве ўяўляецца больш значным, чым вывучэнне асобных ерэтычных рухаў, бо не яны, а менавіта царква вызначала далейшыя лёсы антычнага хрысціянства. Дарэчы, і ў замежнай літаратуры мы не знойдзем спецыяльных абагульняючых даследаванняў па гэтай тэматыцы — як правіла, вывучаліся асобныя аспекты праблемы альбо гісторыя царквы III — пачатку IV ст. разглядалася ў больш шырокім гістарычным кантэксце, што непазбежна «размывала» якасныя характарыстыкі гэтага перыяду.

Так, напрыклад, амаль не сустракаюцца спробы даць агульнае

азначэнне асноўным тэндэнцыям развіцця хрысціянскай царквы ў III — пачатку IV ст. Цікавая думка была выказана ў свой час польскім даследчыкам Ю. Келлерам, які ахарактарызаваў працэс развіцця царквы ў гэты час як яе цэнтралізацыю [1].

Аднак, на мой погляд, такое азначэнне з'яўляецца ўсё ж аднабаковым і не ва ўсім адэкватна адлюстроўвае рашаючы этап у станаўленні хрысціянскай царквы. Больш дакладным будзе характарызаваць агульную лінію развіцця хрысціянскай царквы ў III — пачатку IV ст. як яе *каталізацыю.* Каталізацыю царквы я разумею не проста як асэнсаванне ўсяленскага адзінства хрысціян (гэта існавала яшчэ і да III стагоддзя, і ўпершыню тэрмін «каталіцкая царква» выкарыстаў, відаць, яшчэ Ігнацій Анціахійскі [2]), а як ужо практычную выпрацоўку адпаведных структур: унутрыарганізацыйных і тэрытарыяльных. Гэта і ўніфікацыя (канешне, адносная, з сур'ёзнымі рэгіянальнымі асаблівасцямі) у дагматыцы, культе, сацыяльнай дактрыне, дзе важнай вехай з'явіўся Нікейскі сабор. Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што гэта не азначае адмаўлення рэгіянальных асаблівасцей хрысціянства, асабліва Захаду і Усходу, якія падрыхтавалі ў нейкай меры будучы раскол, але царква менавіта тады выпрацавала свае асноўныя характэрныя рысы ў агульнаімперскім маштабе.

Найбольш яркім выразнікам каталіцкага (г. зн. усяленскага) характару царквы быў карфагенскі епіскап, фактычны мітрапаліт хрысціян рымскай Паўночнай Афрыкі Фасцый Цэцылій Кіпрыян. Тэрмін «каталіцкая царква» для яго ўжо звычны, ён часта выкарыстоўвае яго ў сваіх пасланнях, а адзін з яго трактатаў (De catholicae ecclesiae unitate) у значнай меры прысвечаны абгрунтаванню каталіцкага характару хрысціянскай царквы. Кіпрыян сцвярджае, што царква адзіная, непадзельная, яна ўключае ў сябе «усе цэрквы, якія рассеяны па ўсяму свету» (Epist. 51; 66:7—8). Унутраную структуру царквы ён падае наступным чынам: епіскапат, астатні клір і «усе веруючыя» (Epist. 33:1). Адзінства царквы, па Кіпрыяну, вынікае не толькі з унітарнасці бога, Хрыста, веры, але і епіскапату.

Асэнсоўванне каталіцкага характару царквы праяўлялася і ў распрацоўцы яе містычных канцэпцый, прычым, як на Усходзе, так і на Захадзе Рымскай імперыі. Іншы раз робяцца спробы супрацьпаставіць містычную канцэпцыю царквы ў александрыйцаў Клімента, Арыгена і «практычную» канцэпцыю ў Кіпрыяна. Гэта ўласціва, напрыклад, працам вядомага тэолага Дж. Кэллі [3]. Але ўважлівы аналіз сачыненняў Кіпрыяна паказвае, што і яму былі ўласцівыя трактоўкі царквы як «нявесты», а Хрыста як «жаніха», альбо царквы як «маці», а бога як «бацькі» (Epist. 46; 59:1; 73:10). Тое, што царква ўяўляецца Кіпрыянам як абстрактнае паняцце, якое адрозніваецца ад складаючых яе веруючых, асабліва праяўляецца ў яго алегорыі: царква — «маці», а веруючыя — «дзеці» (Epist. 15:4; 45:1,3; 46). Містычную сувязь царквы з богам у такой алегорыі характарызуе фраза, якую Кіпрыян выкарыстоўвае даволі часта: «Той не можа ўжо мець бацькам бога, каму царква — не маці».

У хрысціянскіх ідэолагаў артадаксальнага кірунку катэгорыя царквы набывае сатэрыялагічную значнасць. Найбольш яскрава гэта адлюстравана ў творах Кіпрыяна, у якога царква выступае пасрэднікам у звышнатуральным паратунку, адкрытым збавіцельным актам Ісуса Хрыста: «Па-за царквою няма паратунку» (Epist. 73:10).

Адной з асноўных тэндэнцый развіцця ўнутранай структуры хрысціянскай царквы ў III ст. была яе іерархізацыя. Прычым яна ахоплівала абодва ўзроўні царкоўнай арганізацыі—і клір, і радавых веруючых.

Даволі ярка праследжваецца імкненне выдзеліць епіскапат з астатняга кліру, асэнсаваць яго асобую, выключную ролю ў царкве. Найбольш выразна гэта назіраецца ў таго ж Кіпрыяна, паводле якога, функцыі епіскапа ў царкве ўніверсальныя — ён распараджаецца ўсімі яе справамі (Epist. 33:1). «І хто не з епіскапам, той і не ў царкве»

(Epist. 56:8). Кіпрыян сцвярджае, што епіскап пастаўлены богам (Epist. 55:8; 66:1,3). Арыген таксама выдзяляў персону епіскапа ў царкве і не толькі ў якасці яе галавы, але і як асобу, што ў іерархіі хрысціян знаходзіцца адразу пасля бога (Contra Celsum 8:75).

Некалькі іншым было становішча епіскапа ў рымскай царкве. Ц. Андрасен заўважыў, напрыклад, дваістыя адносіны да епіскапа ў вядомага рымскага хрысціянскага дзеяча пачатку III ст. Іпаліта: з аднаго боку, вяршэнства епіскапа над клірам, а, з другога, тэндэнцыя да моцнай ролі прэсвітэраў [4]. Аднак, калі прааналізаваць першакрыніцы, якія даюць звесткі аб гэтым да сярэдзіны III ст., то можна заўважыць, што роля прэсвітэраў з часу рымскага епіскапа Стэфана пачала змяншацца, а аўтарытарызм епіскапаў узрастае.

У іерархіі кліра ў III ст. выразна выдзяляюцца тры верхнія ступені: епіскап, прэсвітэр, дзякан. Епіскап выбіраўся, як правіла, з асяроддзя мясцовых прэсвітэраў. Прэсвітэры прысутнічалі на царкоўных саборах, аднак іх колькасць там ў параўнанні з епіскапатам была нязначнай. Ім належала важная роля ў гаспадарчым жыцці царквы (але галоўным распарадчыкам тут быў епіскап), разам з епіскапам прэсвітэры адпраўлялі абрады і набажэнствы, функцыі іх пры гэтым былі строга акрэслены. Дзяканы выконвалі дапаможную ролю ў сферы абраднасці і ў гаспадарчым жыцці царквы.

У III ст. з'явілася і пасада харэпіскапаў (вясковых епіскапаў), што сведчыла аб распаўсюджванні хрысціянства ў сельскай мясцовасці.

З першакрыніц (перш за ўсё з перапіскі Кіпрыяна, Егіпецкага Царкоўнага Ордэра, Яўсевія, пастаноў сабораў, сведчанняў эпіграфікі) нам вядомы і ніжэйшыя пасады кліру: іпадзяканы (або субдзяканы), чытальнікі, экзарцысты, акаліты, дзяканісы, удовы, дзевы. Іпадзяканы, чытальнікі і акаліты выконвалі, галоўным чынам, падсобныя функцыі пры культавых дзеяннях, а таксама ў паўсядзённых царкоўных справах. Экзарцысты — гэта закліналыцікі «дэманаў», персона вельмі папулярная ў III ст., асабліва калі браць пад увагу багаты эпіграфічны матэрыял. Дзяканісы ўпамінаюцца ў крыніцах III—IV ст. рэдка, іх функцыі зведзены толькі да прыслугоўвання пры хрышчэнні жанчын. Статус удоў не ясны, прынамсі, удавой магла стаць не кожная жанчына, якая страціла мужа. Яны не выконвалі ніякіх культавых функцый. Аб дзевах мы ведаем значна больш дзякуючы прысвечанаму ім трактату Кіпрыяна. Дзевы ўрачыста давалі абет цэлібату. Кіпрыян трактуе іх як «нявест Хрыста». Кошт іх аскетызму высокі — яны пазбаўлены праклёну Евы. Дзевы, у разуменні Кіпрыяна, своеасаблівы маральны ідэал для хрысціян, яны належаць да лепшай часткі «статка Хрыстовага».

Першакрыніцы сведчаць аб існаванні асобага абраду — рукапалажэння ў клір. Адносна пасад кліру, да якіх ён прымяняўся, у крыніцах адзінства няма. Калі па эфіопскай версіі Егіпецкага Царкоўнага Ордэра (які адлюстроўваў практыку хрысціян заходняй часткі імперыі), рукапалагаліся толькі дзяканы, прэсвітэры і епіскапы, то па звесткам сірыйскіх «Апостальскіх канстытуцый» (IV—V ст.), рукапалажэнне неабходна і пры ардынацыі іпадзяканаў, чытальнікаў. Магчыма, на захадзе працэс аддзялення трох вышэйшых пасад царкоўнай іерархіі праходзіў больш інтэнсіўна, чым ва ўсходняй частцы імперыі.

Нягледзячы на шэраг адрозненняў, усё ж можна сцвярджаць, што іерархія кліра ў III—пачатку IV ст. мела істотныя агульныя рысы ў хрысціянскіх цэрквах розных рэгіёнаў Рымскай імперыі. Яна не была застылай, мела дынамічны характар. У III ст. з'явіўся шэраг яе новых ступеняў, частка з якіх у працэсе пошуку аптымальнай унутранай структуры царквы ў далейшым знікла. Своеасаблівымі «бакавымі парасткамі» сталі пасады харэпіскапаў, экзарцыстаў, дзяканіс. Удовы і асабліва дзевы ў далейшым уліліся ў рады манашак.

У гістарыяграфіі III ст. даволі часта прадстаўляецца як час працэсу манархізацыі ўлады епіскапату, узмацнення ролі кліру ў царкве,

ліквідацыі дэмакратычнага ладу хрысціянскіх абшчын. З гэтым можна ў асноўным пагадзіцца, але ўсё ж трэба улічваць істотныя нюансы. Гэта быў час росквіту царкоўнай іерархіі, але ж яшчэ не было такога рэзкага аддзялення кліру ад радавых веруючых, як гэта ўсталявалася пазней.

З цягам часу іерархізацыя ахапіла і радавых веруючых. Яна падзяліла іх на дзве ступені: верныя (паўнапраўныя веруючыя, якія прынялі хрышчэнне) і катэхумены (хрысціяне, якія толькі рыхтаваліся да прыняцця хрышчэння, і таму мелі няпоўныя правы ў царкве). У III—IV ст. царкоўны інстытут катэхумената перажываў росквіт. У далейшым у сувязі з шырокай хрысціянізацыяй насельніцтва Рымскай імперыі ён прыйшоў у заняпад і стаў таксама адным з «бакавых парасткаў» царкоўнай структуры.

У III — пачатку IV ст. хрысціянскі клір яшчэ не аформіўся як асобае саслоўе ў дзяржаве, гэта адбылося пазней, у Візантыі, па думку Г. Л. Курбатава, не раней сярэдзіны IV ст.[5].

Працэс каталізацыі царквы ўключаў у III — пачатку IV ст. і выпрацоўку новых тэрытарыяльных структур, для чаго галоўнымі зыходнымі перадумовамі былі распаўсюджванне хрысціянства (гэтаму ў значнай меры садзейнічаў крызіс III ст.) і адносна ўніфікаваная ўнутраная структура царквы ў розных рэгіёнах імперыі. У гэты час замест асобных хрысціянскіх абшчын, якія былі звязаны паміж сабою спарадычнымі кантактамі, зацвярджаецца новая, дагэтуль невядомая структура царквы. Склалася епархіяльная (дыяцэзальная) арганізацыя, калі ніжэйшай адзінкай была парафія (горад з акругай), а тэрыторыя правінцыі састаўляла епархію. Сістэма сельскіх прыходаў яшчэ была неразвітай, відаць, з-за слабага распаўсюджвання хрысціянства ў сельскай мясцовасці. У III ст. пачала пастунова складвацца і мітрапольная сістэма. Так, карфагенскі епіскап Кіпрыян заяўляў, што «наша правінцыя» ўключае ў сябе цэрквы трох афрыканскіх правінцый. Дарэчы, менавіта Кіпрыян першы быў тытулаваны «папам», прычым рымскім духавенствам (Epist. 30; 31; 36), затым «папам» пачаў тытулавацца епіскап Александрыі Максім [6]. У Рыме ж «папам» мясцовы епіскап пачаў называцца не раней другой паловы IV ст.[7]. На Анкірскім і Нікейскім саборах пачатку IV ст. аб епархіяльна-мітрапольнай сістэме гаварылася як аб нечым, што існуе ўжо даўно, і там распрацоўваліся нормы, якія рэгулявалі адносіны паміж кіраўнікамі епархій і мітраполій.

Каталізацыя царквы праявілася і ў такой з'яве, як саборы духавенства, першыя звесткі аб якіх адносяцца яшчэ да другой паловы II ст. На саборы з'язджаліся прадстаўнікі духавенства адной, а часцей некалькіх суседніх правінцый. З першакрыніц нам вядомы саборы ў III— пачатку IV ст. у Нумідзіі, Праконсульскай Афрыцы, у Іспаніі, Малой Азіі, Палесціне, Сірыі, Рыме і г. д. Першым усяленскім саборам лічыцца Нікейскі (хаця яго «усяленскасць» даволі адносная). На саборах вырашаліся асноўныя пытанні царкоўнага жыцця (галоўнае месца тут займала барацьба з ерасямі), дагматыкі, пазіцыі хрысціян у грамадстве.

У літаратуры можна сустрэць супрацьпастаўленне працэса мітрапалізацыі і практыкі склікання сабораў [8]. На мой погляд, і мітрапалізацыя, і саборы былі дзвюма праявамі працэсу каталізацыі царквы. Аўтарытэтнасць мітрапаліта зусім не супярэчыла прыняццю найбольш важных рашэнняў на саборах. Яскравы прыклад таму — дзейнасць карфагенскага «папы» Кіпрыяна, пры якім нейкі час саборы скліканіся амаль штогод.

Першакрыніцы не дазваляюць сцвярджаць аб існаванні ў той час прымата ў хрысціянстве якога-небудзь епіскапа, царквы (ці то рымскай, ці то карфагенскай). Такога роду захады рабіліся (напрыклад, спроба рымскага епіскапа Стэфана навязаць сваю волю іншым цэрквам у пытанні аб перахрышчэнні ератыкоў), але яны сустракалі рашу-

чы адпор з боку іншых прадстаўнікоў епіскапату розных рэгіёнаў Рымскай імперыі. Часцей за ўсё, як сведчыць перапіска Кіпрыяна (Epist. 72:3; 73:26; 75:16) і кесарыйскага епіскапа Фірміліяна, царква ў гэтым плане ўяўляла сабой своеасаблівую канфедэрацыю епіскапаў.

На жаль, памеры артыкула не дазваляюць прааналізаваць іншыя бакі працэсу каталізацыі хрысціянскай царквы (у сацыяльнай дактрыне, дагматыцы, кульце). Але ж і даследаванне асноўных тэндэнцый развіцця арганізацыйных структур царквы дазваляе зрабіць вывад, што працэсы, якія адбываліся ў хрысціянскай царкоўнай арганізацыі III—пачатку IV ст., ішлі ў напрамку станаўлення хрысціянства ў якасці міравой рэлігіі. Патэнцыял гэтых структур раскрыўся ў поўнай меры пасля заключэння саюзу паміж імператарскай уладай і царквою.

[1] Гл.: Keller J. Wczesny Kościoł i jego organizacja // Katolicyzm starożytny jako forma rozwoju pierwotnego chrześcijaństwa. Warszawa, 1969. S. 162.

[2] Гл.: Свенцицкая И. С. Раннее христианство: страницы истории. М., 1987. С. 147.

[3] Гл.: Kelly J. N. D. Early Christian Doctrines. London, 1960. P. 196—197; 215—216.

[4] Гл.: Andresen C. Die Kirche der alten Christenheit. Stuttgart, 1971. S. 65—66.

[5] Гл.: Курбатов Г. Л. История Византии. М., 1984. С. 44.

[6] Гл.: Ранович А. Б. Первоисточники по истории раннего христианства. М., 1933. С. 167—168.

[7] Гл.: Grossi G. F. Trattato di epigraphia cristiana latina e greca del mondo Romano occidentale. Roma, 1968. P. 147.

[8] Гл.: Gentile P. Storia del cristianesimo dalle origini a Teodosio. Milano, 1975. P. 234—235.